833(4Беи)
К13

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.0

КАЖАМЯКІН Генадзь Вячаслававіч

# ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

10.01.01 — беларуская літаратура

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск — 2007

83.3(4Бен)6-8я031
К 13

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Верабей** Анатоль Леанідавіч, Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра беларускай літаратуры і культуры.

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар **Жук** Ігар Васільевіч, УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы", кафедра беларускай літаратуры;

кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Ханеня** Сяргей Іванавіч, УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны", кафедра беларускай літаратуры.

*20504283*

Апаніруючая арганізацыя — УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна".

Абарона адбудзецца 16 лютага 2007 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02. 01. 12 у Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, ауд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-61-40).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта (г.Мінск, пр-т Незалежнасці, 4)

Аўтарэферат разасланы "_____" студзеня 2007 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
дацэнт М. М. Хмяльніцкі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Дагэтуль застаецца не разгледжаны належным чынам шэраг актуальных навуковых пытанняў, звязаных з ідэйна-мастацкай эвалюцыяй творчасці М. Гарэцкага, што залежыць ад светапогляду пісьменніка: адпаведная перыядызацыя, сацыяльная праблематыка, нацыянальная ідэя, пытанні біблейскага кантэксту, канцэпцыя дыялектыкі душы, мадэрнісцкія тэндэнцыі.

Творчасць М. Гарэцкага даследавалася такімі навукоўцамі, як А. Адамовіч, Д. Бугаёў, М. Мушынскі, І. Чыгрын і інш., у матэрыялах Гарэцкіх чытанняў. У той ці іншай ступені раскрыты пэўныя аспекты, звязаныя з гэтай праблематыкай, але адсутнічае яе сістэмнае вывучэнне. Маецца на ўвазе патрэба навуковага вызначэння канцэпцый, якія звязаны з ідэйнасцю і псіхалагічнымі асаблівасцямі яго творчасці. Асобныя аспекты выяўлены ў працах даследчыкаў дэталёва, але супярэчліва: ўзнікла палеміка, натуральная для такога выпадку палярнасць поглядаў.

Акрамя таго, некаторыя творы пісьменніка, як мастацкія, так і публіцыстычныя, асобныя старонкі яго эпісталярнай спадчыны застаюцца недаследаваныя або маладаследаваныя, што часам звязана з бібліяграфічнай рэдкасцю адзінай крыніцы тэксту. Не раскрыты шмат якія цэнзурныя купюры, зробленыя ў савецкіх выданнях М. Гарэцкага. Такія прабелы дагэтуль не давалі магчымасці стварыць паўнавартую навуковую карціну ідэйна-мастацкага зместу творчай спадчыны пісьменніка.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў адпаведнасці з планавымі тэмамі кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ: "Дынаміка беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя" (2001 — 2005, НДР 201); "Канцэптуальныя асновы беларускай літаратуры XX стагоддзя як цэласнага гісторыка-культурнага перыяду" (2001 — 2005, НДР 615/96).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта даследавання — сістэмны аналіз ідэйна-мастацкай эвалюцыі творчасці М. Гарэцкага, выяўленне спецыфікі мастацкага мыслення пісьменніка, яго адметнасці ў паказе рэчаіснасці і раскрыцці характараў.

Для дасягнення заяўленай мэты ставяцца і вырашаюцца наступныя задачы:

– прасачыць на матэрыяле мастацкай і публіцыстычнай прозы М. Гарэцкага ідэйна-творчую эвалюцыю пісьменніка ў працэсе цэласнага разгляду праблематыкі заяўленай тэмы;

– вызначыць ідэйныя асновы творчасці М. Гарэцкага, ахарактарызаваць і абгрунтаваць патрэбу вылучэння асноўных перыядаў творчасці пісьменніка паводле яго светапогляду;

– выявіць аналітыка-псіхалагічныя асаблівасці творчасці М. Гарэцкага ў дыскурсе эвалюцыі яго светапогляду;

– паказаць наватарства М. Гарэцкага ў кантэксце ідэйна-мастацкіх пошукаў

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


беларускай літаратуры;

– прасачыць сувязь паміж творчасцю М. Гарэцкага і творчасцю класікаў сусветнай літаратуры;

– узнавіць шэраг важных купюр, зробленых у савецкіх выданнях твораў пісьменніка, дзеля глыбейшага асэнсавання яго творчасці.

**Аб'ект даследавання** — ідэйна-творчая эвалюцыя М. Гарэцкага, асаблівасці псіхалагізму ў яго творчасці.

**Прадмет даследавання** — ідэйна-мастацкі змест творчасці М. Гарэцкага.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** У рабоце выкарыстаны канкрэтна-аналітычны, параўнальна-гістарычны, параўнальна-супастаўляльны метады.

Канкрэтна-аналітычны метад дазваляе высветліць у даследаванні пытанні ідэйна-мастацкіх асноў творчасці М. Гарэцкага, эвалюцыі яго поглядаў, звязанай з гэтым перыядызацыі творчасці пісьменніка. Параўнальна-гістарычны метад дае магчымасць разгледзець творы М. Гарэцкага ў гістарычным дыскурсе. Маецца на ўвазе і кантэкст гісторыі беларускай літаратуры, і значэнне М. Гарэцкага для беларускай культуры, навукі ў гістарычным параўнанні, і каштоўнасць сказанага пісьменнікам для будучыні. Параўнальна-супастаўляльны метад дазваляе суаднесці творчасць М. Гарэцкага і адпаведныя моманты ў творах іншых літаратараў, як айчынных, так і замежных, а таксама дае магчымасць параўнаць розныя творы пісьменніка. Разам з тым усе тры метады спрыяюць цэласнаму даследаванню ідэйна-мастацкай эвалюцыі творчасці М. Гарэцкага.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**. Ідэйна-мастацкая эвалюцыя творчасці М. Гарэцкага асэнсоўваецца праз аналіз светапогляду пісьменніка і даследуецца як адзіная сістэма.

Навізна заключаецца ў наступным:

— вызначана перыядызацыя, якая адлюстроўвае ідэйна-мастацкую эвалюцыю творчасці М. Гарэцкага і адрозніваецца ад адпаведнай схемы, прапанаванай М. Мушынскім паводле эстэтычнай арыентацыі пісьменніка;

— прааналізаваны асноўныя канцэпцыі М. Гарэцкага, звязаныя з ідэйнасцю яго твораў, што дазволіла ахарактарызаваць творчасць пісьменніка ў больш шырокім кантэксце з выкарыстаннем прыкладаў як з мастацкай, так і з публіцыстычнай прозы;

— рэпрэзентавана канцэпцыя эвалюцыі поглядаў М. Гарэцкага, паказана, што пэўная эстэтычная арыентацыя пісьменніка часам была абумоўлена грамадска-палітычнымі абставінамі, а таму погляды М. Гарэцкага не заўсёды адпавядалі такой творчай скіраванасці;

— разгледжаны шэраг купюр з твораў М. Гарэцкага, што да апошняга часу заставаліся не раскрытыя ў новых выданнях, і гэта мае прынцыпова важнае значэнне для больш глыбокага асэнсавання ідэйна-мастацкага зместу творчасці пісьменніка.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні творчасці М. Гарэцкага,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



улічаны пры напісанні і ўдасканаленні новых падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры ў адпаведных раздзелах для ВНУ і ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пры вывучэнні гісторыі беларускай культуры.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Ідэйнасць творчасці М. Гарэцкага звязана з яго поглядамі, увасобленымі ў мастацкіх, публіцыстычных творах, эпісталярнай спадчыне. Пісьменнік пераважна асэнсоўваў сацыяльныя і нацыянальныя праблемы. Але на першае месца сярод іх ён ставіў нацыянальную праблематыку, якая дамінуе над сацыяльнай, асабліва ў адстойванні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Такі падыход быў для яго прыярытэтным.

2. Даследаванне творчасці М. Гарэцкага дазваляе абгрунтаваць перыядызацыю, якая адлюстроўвае ідэйна-мастацкую эвалюцыю творчасці пісьменніка. Гэта схема не залежыць ад перыядызацыі, вызначанай паводле яго эстэтычнай арыентацыі. Апошняя паказвае, на якія ідэйна-эстэтычныя асновы быў скіраваны М. Гарэцкі. Існуюць прычыны такога адрознення, што матывуецца асаблівай сітуацыяй, якая паўплывала на яго літаратурную дзейнасць, калі пісьменнік не меў магчымасці адкрыта выказваць свае погляды.

3. М. Гарэцкі ўзмацніў і замацаваў у беларускай літаратуры традыцыю псіхалагічнага аналізу. У сваіх мастацкіх творах пісьменнік найбольш дэталёва раскрыў паводзіны героя ў розных жыццёвых абставінах, яго экзістэнцыяльныя адчуванні. У апошнія гады жыцця М. Гарэцкі выявіў рэфлексійны самааналіз: пераасэнсаваў уласныя паводзіны ў мінулым, у тым ліку дапушчаныя памылкі.

4. М. Гарэцкі ўвасобіў у мастацкіх і публіцыстычных творах унікальную канцэпцыю дыялектыкі душы асобы, у аснове якой паказаў характэрнасць кожнаму чалавеку так званай "двудушнасці". Акрамя таго, пісьменнік выявіў дадзеную псіхалагічную асаблівасць у шырокім кантэксце, розных праявах. Такая думка прасочваецца ў яго на працягу ўсёй творчай дзейнасці як вызначальная.

5. У мастацкіх творах М. Гарэцкага суіснуюць рысы рэалізму і мадэрнізму. Апошні прадстаўлены экзістэнцыялізмам у літаратуры, плынню свядомасці. У розныя перыяды пераважаў адзін з іх: пачатак творчай дзейнасці аднachасова рэалістычны і нерэалістычны, пазней — больш вызначаецца рэалізм, а ў апошнія гады жыцця М. Гарэцкі надае шэрагу твораў нерэалістычнае гучанне.

**Асабісты ўклад дысертанта.** Даследаванне з'яўляецца цалкам самастойнай работай.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі** Матэрыялы і палажэнні даследавання абмяркоўваліся: 1) на канферэнцыях "Пятыя (Першыя міжнародныя) Гарэцкія чытанні" (Мінск, 23 — 24 красавіка 1996), "Шостыя Гарэцкія чытанні" (Горкі, 18 — 20 чэрвеня 1997), "Сёмыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 2 — 3 чэрвеня 1998),"Восьмыя Гарэцкія чытанні" (Пінск, 16 — 18 чэрвеня 1999), "Дзевятыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 8 — 9 чэрвеня 2000), "Літаратура. Мова. Культура — II" (Мінск, 5 — 6 кастрычніка 2000), "Дзесятыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 7 чэрвеня 2001), "Пісьменнік — мова — стыль" (Мінск, 15 — 16 лістапада 2001),

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


"Шостыя Міжнародныя Купалаўскія чытанні" (Мінск, 4 — 5 ліпеня 2002), "Адзінаццатыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 18 лютага 2003), "Дванаццатыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 4 мая 2004), "Трынаццатыя Гарэцкія чытанні" (Мінск, 16 чэрвеня 2005).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі** Асноўны змест дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 12 публікацыях: 3 артыкулы апублікаваны ў рэцэнзаваных часопісах, 8 — у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 1 — у энцыклапедычным выданні (усяго 56 ст.).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі працы, трох глаў і заключэння, спісу выкарыстаных крыніц. Поўны аб'ём дысертацыі выкладзены на 115 старонках. Бібліяграфія складае 12 старонак, 188 крыніц.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць, навуковая навізна выбранай тэмы, паказваецца стан яе распрацаванасці, гаворыцца пра сучасны ўзровень гарэцказнаўства. Падкрэсліваецца, што існуе шэраг публікацый, тэматычна блізкіх да праблематыкі гэтай дысертацыі, але патрэбна асобнае цэласнае даследаванне, прысвечанае асэнсаванню ідэйна-мастацкай эвалюцыі творчасці М. Гарэцкага. Сцвярджаецца, што такое даследаванне дазволіць глыбей асэнсаваць творчасць аднаго з найбуйнейшых беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя.

У **першай главе "Трагічны гуманізм і ірацыяналізм у творах М. Гарэцкага"** праведзены аналіз ранняй прозы М. Гарэцкага, упершыню вызначана і абгрунтавана перыядызацыя, звязаная з ідэйна-мастацкай эвалюцыяй творчасці пісьменніка. Пры гэтым разглядаецца іншая перыядызацыя, якая вызначана паводле яго творча-эстэтычнай арыентацыі М. Мушынскім. Тэматыка і названая арыентацыя пісьменніка ў вызначаных навукоўцам перыядах не заўсёды аднолькавая. У гэтым сэнсе канцэпцыя М. Мушынскага слушная, яна мае важнае навуковае значэнне, і каштоўнасць яе несумненная. У дысертацыі даказваецца патрэба вызначэння яшчэ адной перыядызацыі творчасці М. Гарэцкага паводле ідэйна-эстэтычнай эвалюцыі творчасці пісьменніка. Апошняе звязваецца з яго светапоглядам. Тут вылучаюцца тры перыяды:

1) перыяд ранняй творчасці (1912 — 1914). Гэта перш за ўсё зборнік "Рунь", артыкулы "Развагі і думкі", "Наш тэатр", драматызаваная аповесць "Антон", якая мае пераходны характар да наступнага перыяду творчасці М. Гарэцкага. Вызначаюцца рысы экзістэнцыялізму ў літаратуры, звязанага з ім ірацыяналізму, трагічнага гуманізму. Умоўная назва перыяду — **Трагічны гуманізм, ірацыяналізм**;

2) перыяд ад пачатку глабальных сацыяльных катаклізмаў — Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйных змен да арышту М. Гарэцкага ў 1930 г. Асноўныя творы гэтага перыяду: аповесці "Дзве душы", "У чым яго крыўда?", "Меланхолія", "Ціхая плынь", "На імперыялістычнай вайне", шэраг

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

апавяданняў, сярод якіх "Літоўскі хутарок", "Маці", "Панская сучка", "Страшная музыкава песня", "Смачны заяц" і іншыя, публіцыстыка віленскага перыяду жыцця, "Гісторыя беларускае літаратуры". Гэта перыяд творчага сталення. Пісьменнік робіць крок да рацыяналізму, напаўняе прозу новым зместам. Умоўная назва перыяду — **Рацыяналізм**.

3) перыяд літаратурнага выгнання М. Гарэцкага (1930 — 1937). Да яго перш за ўсё адносяцца творы: "Камароўская хроніка", "Віленскія камунары", "Лявоніус Задумекус" і "Скарбы жыцця". Тут назіраецца песімізм, расчараванне пісьменніка ў ранейшых ідэалах, імкненні паўплываць на грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі. Аўтар выказвае сваё бяссілле. Гэта аналіз перажытага, спавядальнасць. Умоўная назва перыяду — **Песімізм**.

Ужо ў самых ранніх апавяданнях пісьменніка вылучаецца праблема пазнання свету чалавекам. Герой М. Гарэцкага шукае і не знаходзіць адказу на пастаўленыя пытанні: "...не толькі як яно, але і адкуль яно?", "адкуля ўсё і што яно?". Гэтак аўтар паказвае немагчымасць пазнання пры такой пастаноўцы пытання. Героі апавяданняў пры гэтым нібы адчуваюць страх. Менавіта страх ад няведання сэнсу існавання характэрны экзістэнцыяльнаму светаадчуванню, што выяўляецца ўжо ў ранняй творчасці М. Гарэцкага ў асобных рысах. **Экзістэнцыялізм у літаратуры** пачаў пашырацца ў Еўропе перад Другой сусветнай вайной. Ён выявіў так званы "трагічны гуманізм" — адчуванне бездапаможнасці, безабароннасці, слабасці, абмежавання магчымасцяў чалавека. Таксама ў творах гэтага літаратурнага кірунку выяўляецца абсурд чалавечага існавання. У кантэксце сусветнай літаратуры экзістэнцыяльную прозу М.Гарэцкага можна разглядаць побач з творамі такіх пісьменікаў, як Р. Акутагава, Ф. Кафка, К. Гамсун, А. Камю, Коба Абэ.

Важнай праблемай ранняй творчасці М. Гарэцкага з'яўляецца антыномія (процістаўленне) двух палярных соцыумаў — сялянства і інтэлігента. Апошні, паказаны аўтарам як выхадзец з вёскі, не можа адарвацца ад "роднага карэння", не жадае яму здраджваць. Вяскоўцы ж не разумеюць яго "панства", як яны самі вызначаюць новыя звычкі вясковага інтэлігента.

Асобна прысутнічае ў кнізе "Рунь" праблема патрыятызму. Яна звязваецца таксама і з тэмай "роднага карэння". Падобнае можна знайсці, напрыклад, у творчасці К. Гамсуна. У апавяданні "Лірныя спевы" М. Гарэцкі апявае слаўную мінуўшчыну Беларусі.

Па-за рамкамі кнігі "Рунь" існуе некалькі твораў М. Гарэцкага, сярод якіх найбольшае значэнне мае апавяданне "Патаёмнае" (1913). У ім пісьменнік, як і ў зборніку, выяўляе праблему пазнання свету, эстэтыку беларускай народнай міфалогіі. Значыць, гэты твор мае агульную ідэйна-мастацкую сувязь са зборнікам. У ранняй мастацкай прозе М. Гарэцкага, такім чынам, паўстала агульная тэматыка "патаёмнага", што разглядаецца сучаснымі навукоўцамі.

Галоўнае для М. Гарэцкага ў праблеме "патаёмнага", акрамя думкі пра складанасць пазнання свету, — эстэтыка міфалогіі, што таксама звязваецца з тэмай "роднага карэння".

У творах пісьменніка можна заўважыць такія складовыя часткі-этапы на-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Несумненна, пісьменнік лічыў абвязковай свабоду сумлення для чалавека, але разумеў недапушчальнасць рэлігійнага экстрэмізму, які вядзе да сацыяльнага крызісу [1, 2, 3, 7].

5. Нацыянальны аспект творчасці М. Гарэцкага раскрываецца ў мастацкіх творах ("Дзве душы", "Ціхая плынь", "Меланхолія" і інш.) і публіцыстычных артыкулах ("Думкі і развагі з прычыны Свята Незалежнасці", "Важны фронт" і інш.). Творчасць пісьменніка скіравана таксама на выхаванне патрыятычных пачуццяў беларускага народа. Сутнасць такой ідэйнасці заключаецца ў сцвярджэнні самастойнага грамадскага ладу беларусаў. Акрамя таго, за канчатковую мэту меў аб'яднанне ўсіх этнаграфічных беларускіх тэрыторый у адзіную дзяржаву, вылучаў прыярытэт нацыянальнага адзінства і згоды дзеля нацыянальнага будаўніцтва.

М. Гарэцкі распрацаваў праграму нацыянальнага Адраджэння Беларусі, дзе важнае значэнне займае выхаванне народа праз народную беларускую культуру, шукаў псіхалагічныя сродкі ўздзеяння на беларуса. Таксама разглядаў нацыянальную псіхалогію (нацыянальны характар) беларуса. У сувязі з асаблівасцямі гэтага надаваў асаблівую ролю ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці такому віду мастацтва, як тэатр.

Асобна ў ідэйна-мастацкіх асновах яго творчасці вылучаецца пазіцыя, што грунтуецца на прызнанні нацыянальнай мовы як святыні, якая павінна захоўвацца. Пісьменнік надае асабліва важнае значэнне ў захаванні беларусаў як нацыі менавіта беларускай мове. Гэта паказвае, што М. Гарэцкі ставіў нацыянальны фактар жыцця народа вышэй за сацыяльны, хоць і лічыў патрэбным аб'яднанне сацыяльных і патрыятычных ідэй [6].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


### Артыкулы ў навуковых часопісах

1. Кажамякін Г. В. Максім Гарэцкі і сусветная літаратура // Весн. Бел. дзярж. ун-та.— Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка.— 2002.— № 2.— С. 8—12.

2. Кажамякін Г. В. Дыялектыка душы ў творах Максіма Гарэцкага // Весн. Бел. дзярж. ун-та.— Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка.— 2003.— № 3.— С. 20—23.

3. Кажамякін Г. "Шукайце брату свайму дарогу...": Максім Гарэцкі і Біблія // Роднае слова.— 2003.— № 6.— С. 73—75.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

4. Кажамякін Г. Максім Гарэцкі і Кузьма Чорны: да праблемы тыпалогіі // Да 100-годдзя Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Кузьмы Чорнага: Зб. навук. арт.; Пад агульн. рэд. Л. Дз. Сіньковай.— Мінск: БДУ, 2001.— С. 131—134.

5. Кажамякін Г. В. Гарэцкі Максім Іванавіч // Беларускі фальклор: Энцыкл.: У 2 т.— Мінск: БелЭн, 2005.— Т. 1.— С. 334—335.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

6. Кажамякін Г. В. Філасофскія погляды Максіма Гарэцкага // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакл. і паведамл. Першых міжнар. чытанняў, Мінск, 23—24 крас. 1996 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ.— Мінск, 1997.— С. 71—75.

7. Кажамякін Г. "Гісторыя беларускае літаратуры" М. Гарэцкага (некаторыя аспекты) // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакл. і паведамл. Шостых чытанняў, Горкі, 18—20 чэрв., 1997 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ.— Мінск, 2000.— С. 61—66.

8. Кажамякін Г. М. Гарэцкі і Ф. Аляхновіч // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакл. і паведамл. на Сёмых чытаннях, Мінск, 2—3 чэрв. 1998 г., Восьмых, чытаннях, Пінск, 16—18 чэрв. 1999 г., Дзевятых чытаннях, Мінск, 8—9 чэрв. 2000 г., Дзесятых чытаннях, Мінск, 7 чэрв. 2001 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ.— Мінск, 2002.— С. 57—62.

9. Кажамякін Г. Асвятленне праблемы п'янства ў творчасці М. Гарэцкага // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы дакл. і паведамл. на Сёмых чытаннях, Мінск, 2—3 чэрв. 1998 г., Восьмых чытаннях, Пінск, 16—18 чэрв. 1999 г., Дзевятых чытаннях, Мінск, 8—9 чэрв. 2000 г., Дзесятых чытанняў, Мінск, 7 чэрв. 2001 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ.— Мінск, 2002.— С. 279—282.

10. Кажамякін Г. Асаблівасці стылю і пабудовы тэксту ў апошніх творах Максіма Гарэцкага // Пісьменнік — мова — стыль: Матэрыялы II Міжнар. канф., прысв. 75-годдзю з дня нараджэння праф. Л. М. Шакуна, Мінск, 15—16 лістап. 2001 г. / Бел. дзярж. ун-т.— У 2 т.— Мінск, 2002. — Т. 1.— С. 63—67.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


11. Кажамякін Г. В. Янка Купала і Максім Гарэцкі // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс: VI Міжнар. Купалаўскія чытанні: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 4—5 ліп. 2002 г. / Дзярж. літ. музей Янкі Купалы.— Мінск, 2003. — С. 49—55.

12. Кажамякін Г. Светапоглядная перыядызацыя творчасці Максіма Гарэцкага // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць: Матэрыялы XII Гарэцкіх чытанняў.— Мінск, 4 мая 2004 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ.— Мінск, 2005.— С. 43—47.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЭЗЮМЭ

**Кажамякін Генадзь Вячаслававіч**
**Ідэйна-мастацкая эвалюцыя творчасці Максіма Гарэцкага**

*Ключавыя словы:* Эвалюцыя, ідэйна-мастацкі, перыядызацыя, псіхалагізм, псіхалагічны аналіз, экзістэнцыялізм у літаратуры, сацыяльны, нацыянальны, патрыятызм, канцэпцыя, дыялектыка душы, амбівалентнасць, гуманізм, біблейскі кантэкст, плынь свядомасці.

У дысертацыі даследуецца ідэйна-мастацкая эвалюцыя творчасці класіка беларускай літаратуры XX стагоддзя Максіма Гарэцкага. Матэрыялам для даследавання сталі творы мастацкай, публіцыстычнай, навуковай прозы пісьменніка, яго эпісталярная спадчына, успаміны пра яго, навуковыя працы, прысвечаныя М. Гарэцкаму. Упершыню ў гарэцказнаўстве прапануецца перыядызацыя, звязаная з ідэйна-мастацкай эвалюцыяй яго творчасці, абгрунтоўваецца яе патрэба. Вызначаюцца рысы паэтыкі мадэрнізму, які прысутнічае ў мастацкай прозе М. Гарэцкага разам з рэалізмам, экзістэнцыялізмам у літаратуры, плынню свядомасці. Раскрываюцца некаторыя купюры, зробленыя ў савецкіх публікацыях яго твораў. Грунтоўна разглядаецца сацыяльная і нацыянальная праблематыка, біблейскі кантэкст ў творчасці пісьменніка. Аналізуецца яго унікальная канцэпцыя дваістасці душы асобы. Творчасць М. Гарэцкага даследуецца ў параўнанні з творамі такіх сусветнавядомых пісьменнікаў, як Ф. Дастаеўскі, К. Гамсун, Э. Хэмінгуэй і інш.

Выкарыстоўваюцца канкрэтна-аналітычны, параўнальна-гістарычны, параўнальна-супастаўляльны метады даследавання.

Ідэйна-мастацкія асновы творчасці М. Гарэцкага не былі раней грунтоўна даследаваны ў адзінай навуковай працы. Гэта не давала магчымасці ўявіць такую з'яву ў цэласнасці, зрабіць агульныя высновы.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні творчасці М. Гарэцкага, пры распрацоўцы і ўдасканаленні падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры і культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# РЕЗЮМЕ

**Кожемякин Геннадий Вячеславович**

**Идейно-художественная эволюция творчества Максима Горецкого**

*Ключевые слова*: Эволюция, идейно-художественный, периодизация, психологизм, психологический анализ, экзистенциализм в литературе, социальный, национальный, патриотизм, концепция, диалектика души, амбивалентность, гуманизм, библейский контекст, поток сознания.

В диссертации исследуется идейно-художественая эволюция творчества класика белорусской литературы XX столетия Максима Горецкого. Материалом для исследования стали произведения художественной, публицистической, научной прозы писателя, его эпистолярное наследие, воспоминания о нем, научные труды, посвященные М. Горецкому. Впервые в горецковедении предлагается периодизация, связанная с идейно-художественной эволюцией его творчества, обосновывается её необходимость. Определяются черты поэтики модернизма, который присутствует в художественной прозе М. Горецкого наряду с реализмом, экзистенциализмом в литературе, потоком сознания. Раскрываются некоторые купюры, сделанные в советских публикациях его произведений. Основательно рассматривается социальная и национальная проблематика, библейский контекст в творчестве писателя. Анализируется его уникальная концепция двоистости души личности. Творчество М. Горецкого исследуется в сравнении с произведениями таких всемирно известных писателей, как Ф. Достоевский, К. Гамсун, Э. Хемингуэй и др.

Используются конкретно-аналитический, сравнительно-исторический, сравнительно-сопоставительный методы исследования.

Идейно-художествнные основы М. Горецкого не были раньше основательно исследованы в единой научной работе. Это не давало возможности представить такое явление в целостности, сделать общие выводы.

Материалы диссертации могут быть использованы при дальнейшем исследовании творчества М. Горецкого, при разработке и совершенствовании учебников и учебных пособий по истории белорусской литературы и культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## SUMMARY

**Kazhamyakin Guenadz V**

# Ideological-artistic evolution of Maxim Garetsky's Creation

**Key words:** Evolution, ideological-artistic, periodization, psychological insight, psychological analysis, existentialism in literature, social, national, patriotism, concept, soul dialectics, ambivalence, humanism, Bible context, stream of consciousness.

The ideological-artistic of the creation of the classical Belarusian author of the 20th century Maxim Garetsky is studied in this thesis. The material for the research constituted literary, publicistic, scientific prose of the author, his epistolary heritage, memoirs about his, and scientific works dedicated to M. Garetsky. In the thesis for the first time in the works dedicated to the creative activity of M. Garetsky the periodization by ideological-artistic evolution of his creative work is determined, and its necessity is grounded. There is also a description of the characteristics of some literary directions that are present in a literary prose by M. Garetsky — such as existentialism in a literature, stream of consciousness. Some denominations in author's publications of the Soviet periods are revealed. Social and national problems, Bible context in the writer's works are thoroughly considered. His unique concept about dualism of person's soul is analysed. The creative activity of M.Garetsky is studied in comparison with the works of the world's famous writers such as F. Dostoevsky, K. Gamsun, E. Hemingway and others.

The following **methods of research** are used: concrete analytical, comparative historical and comparative contrastive.

The ideological-artistic foundations of M. Garetsky's creation has not been earlier studied thoroughly in a single research work. It did not provide an opportunity to present this phenomenon in integrity, to make general conclusions.

**The materials of this thesis** can be **used** in further researches of M. Garetsky's creative activity, for development and improvement of textbooks and school-books in History of Belarusian literature and culture.

